Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________ Л.Л.Ражкова
«30» ___06___ 2025

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
____________ І.М.Грамовіч
«30» ___06___ 2025

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# БЕЛАРУСКІ ПОБЫТАВЫ ТАНЕЦ

*для спецыяльнасцей:*
*6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў,*
*прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва,*
*6-05-0215-09 Харавая творчасць,*
*прафілізацыі: Харавая музыка народная,*
*6-05-0215-11 Фальклор,*
*прафілізацыі: Этнафоназнаўства*

Складальнік: Хамутова І.В., выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжаны і зацверджаны
на пасяджэнні Савета факультэта
«30» ___06___ 2025 г., пратакол №10

Мінск, 2025

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

*Т. І. Кухаронак*, старшы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

*кафедрай народна-песеннай творчасці і фальклору* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № ад);
*навукова-метадычным саветам* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № ад)

# ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА .......................................................................... 4

1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ............................................................................ 6

1.1. Змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец»: тэарэтычная частка…………..…………………………6

2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ............................................................................. 9

2.1 Змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец»: практычная частка…………………………………9

2.2. Метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам…………………………13

2.2.1.Крытэрыі адзнакі………………………………………………………..13

2.2.2. Прыклад танцавальнай размінкі………………………………………14

2.3. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў……………………………………………………………………..15

3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ........................................................................16

3.1. Рэкамедаваныя сродкі дыягностыкі……………………………..……16

3.2. Рэпертуарны спіс………………………………………………………..16

4. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ ............................................................................. 19

4.1. Вучэбная праграма……………………………………………………...19

4.2. Асноўная літаратура……………………………………..……..26

4.3. Дадатковая літаратура…………………………………………..…26

4.4. Запісы побытавых танцаў…………………………………………30

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец» неабходны для вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «Спевы», напрамку спецыяльнасцей: 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва, 6-05-0215-09 Харавая творчасць, прафілізацыі: Харавая музыка народная, 6-05-0215-11 Фальклор, прафілізацыі: Этнафоназнаўства, у адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 08.11.2022 № 427.

Мэтай выдання з'яўляецца ўвядзенне ў навучальны працэс класіфікацый побытавых танцаў, а таксама крытэрыяў, якія дазваляюць стандартызаваць працэс ацэнкі засваення студэнтамі ключавых палажэнняў вучэбнай дысцыпліны.

Асноўнымі задачамі ВМК з'яўляюцца:

– забеспячэнне павышэння якасці атрымання адукацыі па ўзгаданых спецыяльнасцях;

– акрэсліванне дыдактычных сродкаў навучання, арыентаваных на найбольш поўную рэалізацыю адукацыйных задач, сфармуляваных у вучэбнай праграме УВА па дысцыпліне «Беларускі побытавы танец»;

– пашырэнне агульных і прафесійных ведаў: ажыццяўленне вучэбна-метадычным суправаджэннем паслядоўнага засваення студэнтамі тэарэтычных ведаў і практыкі выканальніцкага майстэрства;

– аказанне дапамогі студэнтам УВА ў набыцці і засваенні ведаў як тэарэтычнага, так і практычнага характару ў вобласці выканальніцтва беларускага побытавага танцу.

Раздзелы, уключаныя ў ВМК, неабходныя для аптымальнага суправаджэння адукацыйнага працэсу і фарміравання ў студэнтаў кампетэнцый для вырашэння прафесійных задач.

Структурнымі элементамі вучэбна-метадычнага забеспячэння, якія прадстаўлены ў ВМК, з'яўляюцца вучэбна-праграмныя, вучэбна-метадычныя і інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.

У тэарэтычным раздзеле ВМК адлюстраваны змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец», а таксама тэарэтычны матэрыял адпаведна патрабаванням вучэбнай праграмы.

Практычны раздзел асвятляе практычную частку работы студэнтаў па матэрыяле вучэбнай дысцыпліны (комплексы асноўных рухаў у побытавым танцы, класіфікацыі танцаў па колькасці выканаўцаў і прымеркаванасці, заданні для самастойнай работы), метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам, а таксама рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў.

Раздзел кантролю ведаў прадстаўлены матэрыяламі для маніторынгу вынікаў дзейнасці студэнтаў і ўключае ў сябе прыкладны рэпертуарны спіс для бягучай атэстацыі і заліку, спіс рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Дадатковы раздзел уключае вучэбную праграму па дадзенай вучэбнай дысцыпліне і відэазапісы побытавых танцаў.

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 1.1. Змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец»: тэарэтычная частка

Дысцыпліна «Беларускі побытавы танец» знаёміць студэнтаў з народнымі лакальнымі традыцыямі выканання побытавых танцаў, а таксама дапамагае вызначыць комплекс рухаў, уласцівы традыцыйнай танцавальнай культуры на тэрыторыі ўсёй Беларусі.

Мэта вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў прафісійных кампетэнцый ў галіне традыцыйнай харэаграфічнай культуры беларусаў.

Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўным комплексам рухаў побытавых танцаў;

– авалодаць стылістыкай выканання беларускага побытавага танцу адпаведна лакальным традыцыям;

– развіць навык імправізацыі на падставе традыцыйнай стылістыкі;

– засвоіць класіфікацыю побытавых танцаў.

Тэарэтычныя і практычныя матэрыялы, змешчаныя ў ВМК, дапамагаюць студэнту па заканчэнні вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец»:

ведаць:

– асноўныя элементы беларускага побытавага танцу;

– лакальныя версіі побытавых танцаў беларусаў;

умець:

– імправізаваць на падставе традыцыйных рухаў, уласцівых беларускаму побытаваму танцу;

– класіфікаваць побытавыя танцы;

валодаць

– выкананнем кампазіцый побытавых танцаў.

Студэнты знаёмяцца з класіфікацыяй побытавых танцаў Зм. Бядулі, якая прадстаўлена ў яго працы «З нарысаў па гісторыі беларускага тэатра».

Важным тэарэтычным пытаннем дадзеннай дысцыпліны з’яўляецца разгляд генэзісу беларускага побытавага танцу. Так, вытокі танцавальнай традыцыі знаходзяцца ў абрадавых дзеях, калі, у адпаведнасці са светапоглядам мясцовых жыхароў, кожны рух меў сваё семантычнае значэнне. Напрыклад, прытопы ўласцівыя для веснавых карагодаў, яны сімвалізавалі абуджэнне зямлі. Далей танцавальная традыцыя атрымала сваё развіццё, калі яе функцыя ад аграрна-магічнай перайшла да культурна-эстэтычнай.

Танцавальная культура беларусаў мае лакальную разнастайнасць, прытым як кампазіцый, так і ўвогуле пластыкі рухаў. Харэаграфічнае мастацтва мае сваю спецыфіку ў кожным этнаграфічным рэгіёне нашай краіны, што адлюстравана выбітным этнахарэолагам М. А. Козенка ў серыі кніг «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (у 6 тамах).

Побытавы танец знаходзіў сваё месца ў каляндарна-абрадавым і сямейна-абрадавым фальклоры.

У сямейна-абрадавым фальклоры танцавальныя пластычныя рухі сустакаюцца ў радзільнай і вясельнай абраднасці, як, напрыклад, падскокі жанчын-каравайніц падчас выпякання вясельнага караваю з мэтай эмітатыўнай магіі – каб цеста высока паднялося.

У каляндарна-абрадавым фальклоры пластычныя рухі сустракаюцца ў абрадавых гульнях. Так, напрыклад, у каляднай гульні «Жаніцьба Цярэшкі» на Паазер’і абавязковым танцам з’яўляецца «Лявоніха», дзе ўдзельнікі гульні па парах аб’ядноўваюцца ў руху дадзенага танца.

Усе вялікія каляндарныя святы, такія як Купалле, Багач, Каляды, Саракі і інш., былі багатыя на выканенне побытавых танцаў. Некаторыя з іх, як «Полька Спораўская» (вёска Спорава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці), уваходзяць у інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашай дзяржавы (шыфр у Дзяржаўнам спісе: 13Б0000076; дата ўключэння 02.08.2016).

Выкананне побытавых танцаў было ўласціва і для так званых вячорак – сезоннай формы правядзення вольнага часу вясковай моладдзю ў асенне-

зімовы перыяд. Акрамя рэкрэацыйнай побытавыя танцы ігралі і камунікатыўную функцыю – знаёмства моладзі і выхаванне культуры зносін.

# 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. Змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Беларускі побытавы танец»: практычная частка

Студэнты знаёмяцца з асаблівасцямі пластыкі рухаў, лексікай, уласцівай да побытавага танцу беларусаў.

Вывучэнне элементаў народнай харэаграфіі пачынаецца з танцавальных крокаў: «трохкрок», «вяровачка», «галоп», «полька-трасуха», «дробная полька», «полька-скакуха», «сцелісты крок» і інш.

Значным складальнікам лексікі народнага танцу з’яўляецца выпрацоўка правільнай, прыгожай паставы корпуса – лапаткі сабраныя разам, галава трымаецца прама, макушка накіравана ўверх як працяг пазваночнага слупа. Гэта дае магчымасць кантраляваць раўнавагу і разнявольвае рухомасць суставаў, што не толькі ставарае эстэтычны вобраз, але і дапамагае знізіць траўматызм і сфарміраваць тэхніку выканання.

Асноўнымі пераходнымі кропкамі побытавага танцу з’яўляюцца прытупы, найбольш сустракаюцца наступныя: адзінарны прытуп з акцэнтам у гору і адзінарны прытуп з акцэнтам уніз, двайныя і трайныя прытупы (адной нагой альбо чаргуючы ногі), а таксама танцавальныя ключы (поўны ключ і з сінкопай).

Заняткі пачынаюцца і завяршаюцца выкананнем танцавальных паклонаў з улікам гендэрнай прыналежнасці.

Жаночы паклон.

Танцор стаіць у 6-й танцавальнай паставе ног. Рукі ўздоўж корпуса. Звычайным побытавым крокам танцоры рухаюцца 2 такты наперад. Наступны такт – рукі перакрыжоўваюць перад грудзьмі, імітуючы жэст прытрымлівання караляў, якіх у беларускай традыцыі апраналі багата. Далей 4-ы такт – паклон – нахіл галавы і корпуса (стрымана). Затым танцор звычайным побытавым крокам адыходзіць назад (2 такта), пры гэтым на 5-ы такт рукі апускаюцца ўздоўж корпусу. Завяршаецца танцавальны паклон завядзеннем правай рукі да

сэрца (7-ы такт) і непасрэдна нахілам галавы з адвядзеннем правай рукі на першапачатковую паставу (8-ы такт).

Мужчынскі паклон.

Танцор стаіць у 6-й танцавальнай паставе ног. Рукі ўздоўж корпуса. 1-ы такт – танцор паварочвае корпус у правы бок на 45° прыстаўным крокам (з правай нагі), затым, на 2-гі такт, заводзіць правую руку да сэрца, 3-ці такт – паклон (нахіл галавы і корпуса (стрымана)), 4-ты такт – рука апускаецца ў першапачатковую паставу. 5-ы – 8-ы такты – танцор разварочвае корпус ў левы бок на 90°. Кампазіцыя паўтараецца з левай нагі.

Уменне лёгка, грацыёзна, манерна рухацца выпрацоўваецца праз выкананне танцавальнай размінкі на пачатку кожнага з заняткаў (прыклад прадстаўлены ў раздзеле 2.2. «Метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам»). Першыя практыкаванні накіраваныя на разаграванне цягліц плечавога аддзела, затым – паяснога аддзела і ног.

Аўдыторная работа ўключае вывучэнне танцавальнай традыцыі розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, рознай прымеркаванасці і функцый. Дзеля прыкладу разгледзім узоры парных побытавых танцаў лакальнай традыцыі аг. Скірмантава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

## Танец «Месяц»

Музычны памер 4/4.

Пара становіцца тварам па руху танца (супраць ходу сонца). Хлопец – левым плячом да ўмоўнага цэнтра кола. Рукі ў адкрытай паставе. Унутраныя рукі ў пары злучаныя і прыўзнятыя да ўзроўню грудзей.

1-ы такт – з вонкавых ног крок наперад на моцную долю.

2-гі такт – з вольных ног крок назад на моцную долю.

3-4-ы такты – мужчыны крокам, пачынаючы з вонкавых ног, рухаюцца наперад па ходу танца, дзяўчына з правай нагі рухаецца наперад, робячы паварот вакол сваёй восі (праз правае плячо – ад партнёра).

5-8-ы такты – паўтараецца папярэдняя частка.

9-10-ы такты – пара рухаецца з вонкавых ног крокам наперад.

11-12-ы такты – пара рухаецца супраць ходу танца спіной наперад з вольных ног папярэднім крокам.

13-ы такт – хлопцы становяцца спіной да ўмоўнага цэнтра кола. Дзяўчына – насупраць, тварам да партнёра. На моцную долю пляскаюць у далоні.

14-ы такт – у той жа паставе пара хлопае на моцную долю адно другому ў далоні.

15-16-ы такты – пара, трымаючыся ў папярэдней паставе, хлопае ў далоні тройчы (на моцную долю, затым на слабую і зноў на моцную).

Пасля кампазіцыя паўтараецца спачатку.

Танец «Ночка»

Музычны памер 2/4.

Пара становіцца ў наступную паставу – мужчына ўнутры ўмоўнага кола, дзяўчына насупраць яго. Рукі ў закрытай паставе, злучаныя паралельна паміж сабой на ўзроўні пояса. Пара стаіць у паў-абароце па ходу танца.

1-ы такт – пара крокам рухаецца па ходу танца (супраць гадзіннікавай стрэлкі па агульнаму колу).

2-гі такт – пара разварочваецца ў паў-абарота, тварам супраць ходу танца і крокам рухаецца па гадзіннікавай стрэлцы па агульным коле.

3-4-ы такты – паўтараецца папярэдняя частка.

5-ы такт – хлопец паварочваецца тварам па ходу танца. Дзяўчына – спіной па ходу танца. Крокам рухаюцца па ходу танца.

6-ы такт – пара разварочваецца на 180º. Кавалер наступае на партнёрку. Партнёрка адступае спіной наперад.

7-8-ы такты – паўтор 5-6-га тактаў.

9-ы такт – пара змяняе паставу на адкрытую. Злучаныя ўнутраныя рукі. З вонкавых ног робяць крок наперад і крок назад.

10-ы такт – кавалер рухаецца з левай нагі крокам па ходу танца. Партнёрка – з правай нагі крокам паварочваецца вакол сваёй восі праз правае плячо (ад партнёра), пры гэтым рухаючысь па ходу танца.

11-12-ы такты – паўтор рухаў 9-га і 10-га тактаў.

13-ы такт – пара тварам па ходу танца рухаецца крокам наперад па ходу танца.

14-ы такт – пара рухаецца спіной наперад, супраць ходу танца.

15–16-ы такты – пара ў вальсавай паставе полькай скакухай паварочваецца вакол сваёй восі па гадзіннікавай стрэлцы, пры гэтым рухаючыся па ходу танца.

Выконваецца пад наступныя прыпеўкі:

А ночка цёмна, а я баюся,
Правядзі мяне, Маруся.
Праважала, руку жала,
А да дому праважала.

Ночка цёмна, не плач, Маруся.
Я з табою ажанюся.
Ажанюся, за Марусю.
Здзесь спяваюць, весела гуляюць.

Як вядома, побытавыя танцы класіфікуюцца па колькасці выканаўцаў: сольныя, парныя, у тройках, у чацьвёрках, парна-гуртавыя, танцы тыпу «кадрыль», гуртавыя танцы. Студэнты вывучаюць кожны з тыпаў побытавых танцаў. Аўдыторная работа мае на мэце не толькі азнаямленне з традыцыяй, але і адпрацоўку выканальніцкага майстэрства кожнага са студэнтаў.

На занятку адпрацоўваецца майстэрства імправізацыі ў стылістыцы, уласцівай побытавым танцам беларусаў.

## 2.2. Метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам

### 2.2.1.Крытэрыі адзнакі

10 (дзесяць) балаў — сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны, а таксама выкананне самастойнай працы, якая выходзіць за межы аўдыторнай работы; творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны ўдзел у групавых шматкаленных танцах, высокі ўзровень культуры выканання ўсіх побытавых танцаў, прадугледжаных праграмай; маецца навык імправізацыі ў адпаведнай стылістыцы.

9 (дзевяць) балаў — сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны, а таксама выканенне самастойнай працы, якая выходзіць за межы аўдыторнай работы; творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны ўдзел у групавых шматкаленных танцах, высокі ўзровень культуры выканання ўсіх побытавыых танцаў, прадугледжаных праграмай.

8 (восем) балаў — поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны, а таксама выканенне самастойнай працы, якая выходзіць за межы аўдыторнай работы; творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны ўдзел у групавых шматкаленных танцах, высокі ўзровень культуры выканання ўсіх побытавыых танцаў, прадугледжаных праграмай.

7 (сем) балаў — поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны, а таксама выкананне самастойнай працы, якая выходзіць за межы аўдыторнай работы; творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны ўдзел у групавых шматкаленных танцах, захаванне стылістыкі выканання.

6 (шэсць) балаў — валоданне стылістыкай выканання побытавых танцаў, поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай дысцыпліны, а таксама выкананне самастойнай працы, якая выходзіць за межы аўдыторнай работы.

5 (пяць) балаў — валоданне стылістыкай выканання побытавых танцаў, засваенне ўсіх раздзелаў вучэбнай дысцыпліны, удзел у шматфігурных танцах.

4 (чатыры) балы — уменне выконваць сольныя, парныя, у тройках і ў чацьвёрках побытавыя танцы. Валоданне пластыкай рухаў, уласцівай беларускаму побытаваму танцу.

3 (тры) балы — выкананне побытавых танцаў, прадугледжаных праграмай, з парушэннем стылістычных асаблівасцей.

2 (два) балы — выкананне асобных найбольш распаўсюджаных для побытавага танцу рухаў.

1 (адзін) бал — адсутнасць ведаў па дадзенай вучэбнай дысцыпліне.

### 2.2.2. Прыклад танцавальнай размінкі

Метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам уключаюць у сябе прыклад танцавальнай размінкі ў межах вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец».

Танцавальная размінка:

1. Рухі плячыма (на моцную долю плечы ўздымаюцца ўгору, на слабую – апускаюцца ўніз);

2. Рухі плячыма і каленьмі (на моцную долю плечы ўздымаюцца ўгору, мускулатура ног падцягваецца, на слабую долю плечы апускаюцца ўніз, і выконваецца паў-прысяданне з акцэнтам уніз);

3. Паў-прысяданні і поўнае прысяданне (на першыя 2 такты робіцца паў-прысяданне (пяткі не ўздымаюцца ад падлогі), на другія 2 такты мускулатура падцягваецца ўгору (паўтараецца 2 разы), 8-12 такты запаўняюцца поўным прысяданнем, 12-16 такты – выканавец павольна ўздымаецца і падцягвае мускулатуру ўгору, робячы на гэта акцэнт);

4. Прысядка (на моцную долю выканавец прысядае, на слабую – устае);

5. Адпрацоўка элемента побытавага танцу «Дробная полька»;

6. Адпрацоўка трохкрока (на месцы і ў павароце вакол сваёй восі, першапачаткова на 180º і 180º за адзін такт, затым на 360º і 360º за адзін такт). Рухі выконваюцца пад музычнае суправаджэнне «Полька імправізаваная».

## 2.3. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў у межах раздзела вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец» уключае ў сябе наступныя формы:

– вывучэнне матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны;

– выкарыстанне відэаматэрыялаў;

– падрыхтоўка імправізаваных танцаў;

– падрыхтоўка да практычных заняткаў, бягучай атэстацыі і заліку.

Вывучэнне матэрыялаў мае на мэце працу студэнтаў з відэазапісамі, друкаванай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнэт.

Выкарыстанне відэаматэрыялаў з’яўляецца адной з найбольш значных форм самастойнай работы ў межах вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец». Яно складаецца з прагляда, аналіза і расшыфроўкі відэазапісаў харэаграфічных узораў у выкананні носьбітаў традыцый пэўнай лакальнай мікразоны.

Падрыхтоўка імправізаваных танцаў складае значную частку самастойнай работы студэнтаў, якая прадугледжвае самастойную падрыхтоўку кампазіцыі імправізаванага побытавага танцу з захаваннем стылістыкі выканання носьбітамі традыцыі.

Падрыхтоўка да практычных заняткаў і заліку патрабуе творчага падыходу (назапашванне вопыту танцавальнай імправізацыі), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры, авалодванне тэарэтычнымі ведамі і адчуваннем стылю побытавага танцу.

У выніку станоўчага выканання самастойнай працы студэнты атрымліваюць прафесійныя веды, уменні і навыкі, якія неабходныя для працы на базах-заказчыках кадраў.

# 3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 3.1. Рэкамедаваныя сродкі дыягностыкі

Рэкамендаванымі сродкамі дыягностыкі з’яўляюцца наступныя:

1. Паказ імправізаваных побытавых танцаў адпаведна традыцыі;

2. Паказ рэканструяваных побытавых танцаў у традыцыйнай манеры выканання;

3. Вуснае апытанне;

4. Прагляд (у межах бягучай атэстацыі);

5. Залік.

Бягучая атэстацыя ў сярэдзіне вучэбнага семестра ў форме творчай работы.

Залік адбываецца ў форме творчага паказу.

## 3.2. Рэпертуарны спіс

***Для самастойнай работы студэнтаў***

1. «На рэчанькі» (Жыткавіцкі р-н., Гомельская вобласць);

2. Кадрыль «Зеркала па-пухавіцкі»;

3. Парны танец «Месяц» (в. Казловічы, Слуцкі р-н, Мінская вобл);

4. «Іванкаўшчынская кадрыля» (на 2 пары), (в. Іванкаўшчына, Мазырскі р-н, Гомельская вобл.);

5. «Дзербінкаўская кадрыля» (на 2 пары) (в. Дзербінкі, Мазырскі р-н, Гомельская вобл.);

6. «Вярэцкая кадрыля» (на 2 пары) (в. Вярэчча, Гарадоцкі р-н, Віцебская вобл.).

Дадзеныя творы з прыватнага архіву М. А. Козенка прыкладаюцца на дысках ў дадатковым раздзеле.

***Для аўдыторнай работы***

Сольныя танцы:

1. «Чобаты», сольны ілюстрацыйна-выяўленчы танец;

2. «Жабка», сольны ілюстрацыйна-выяўленчы танец;

3. «Барыня», сольна-гуртавы арнаментальны танец;

4. «Лявоніха», сольны танец;

5. «Раскамарыцкі», сольны жаночы танец;

Парныя танцы:

6. «Ганно» (Гомельская вобласць);

7. «Абэрак» (в. Мётча, Барысаўскі р-н., Мінская вобл.);

8. «Каханачка» (Любанскі р-н., Мінская вобласць);

9. «Ночка» (в. Слабада, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць);

10. «Лысы» (Смаргонскі р-н, Гродзенская вобл.);

11. «Мілашка» (в. Старая Рудня, Смаргонскі р-н., Гродзенская вобл.);

12. «Вальс-вішанька» (в. Шутавічы, Смаргонскі р-н., Гродзенская вобл.);

13. «Двойка» (парны танец) (в. Гайна, Лагойскі р-н, Мінская вобл.);

14. «Шамяля» («Шамель»,«Ойся») (парны танец) (в. Целепуны, мікрараён г. Мазыра, Гомельская вобл.);

15. «Каваль» (в. Белая, Мазырскі р-н., Гомельская вобл.);

16. «Казачок» (в. Лядзец, Столінскі раён, Брэсцкая вобл.);

17. «На рэчанькі» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі р-н., Брэсцкая вобласць);

18. «Ойра» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі р-н., Брэсцкая вобласць);

19. «Пакруціха» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі р-н., Брэсцкая вобласць);

20. «Полька імправізаваная»;

Танцы тройкамі:

21. «Кракавяк у тройках» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі р-н., Брэсцкая вобл.);

22. «Лявоніха» (тройкамі) (в. Пянькі, Мазырскі р-н., Гомельская вобл.);

Танцы ў чацвёрках:

23. «Церніца» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі р-н., Брэсцкая вобл.);

24. «Каханачка» (аг. Ракаў, Мінская вобл.);

Парна-гуртавыя танцы:

25. «Лявоніха» (калена кадрылі) (в. Гарадзец, Краснапольскі р–н., Магілёўская вобл.);

26. «Конкавіцкая кадрыля» (на 2 пары) (в. Конкавічы, Петрыкаўскі р-н Гомельская вобл.);

27. «Котчынская Кадрыль»;

28. «Левашоўская кадрыля» (на 2 пары), (в. Левашы, Рэчыцкі р-н, Гомельская вобл.).

# 4. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ

## 4.1. Вучэбная праграма

### Тлумачальная запіска

Традыцыйныя беларускія побытавыя танцы з'яўляюцца каштоўнасцю нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашай краіны. Побытавы танец адлюстроўвае характэрныя рысы культуры, якія выяўляюцца ў яго пабудове і стылі, музычным суправаджэнні, адзенні танцораў, іх манерах паводзін і пластыцы рухаў адпаведна традыцыі.

Вучэбная дысцыпліна «Беларускі побытавы танец» знаёміць студэнтаў з народнымі лакальнымі традыцыямі выканання побытавых танцаў, а таксама дапамагае вызначыць комплекс рухаў, уласцівы традыцыйнай танцавальнай культуры на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Раздзелы праграмы зробленыя адпаведна класіфікацыі Зм. Бядулі, якая прадстаўлена ў яго працы «З нарысаў па гісторыі беларускага тэатра».

Курс цесна звязаны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, паколькі ўводзіць студэнтаў у кантэкст стылістыкі пластыкі рухаў, уласцівай беларусам: «Танец у народным хоры», «Харавы клас», «Фальклорны практыкум», «Пазаабрадавая творчасць», «Выканальніцкае майстэрства».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў прафісійных кампетэнцый у галіне традыцыйнай харэаграфічнай культуры беларусаў.

Спецыяліст павінен умець:

БПК-13 Выкарыстоўваць элементы беларускага народнага танцу падчас выканання народнай песні;

БПК-15 Выкарыстоўваць лексіку побытавага танцу ў практычнай дзейнасці;

ПК-18 Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўным комплексам рухаў побытавых танцаў;

– авалодаць стылістыкай выканання беларускага побытавага танцу адпаведна лакальным традыцыям;

– развіць навык імправізацыі на падставе традыцыйнай стылістыкі;

– засвоіць класіфікацыю побытавых танцаў.

Па заканчэнні вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец» студэнт павінен:

*ведаць*:

– асноўныя элементы беларускага побытавага танцу;

– лакальныя версіі побытавых танцаў беларусаў;

*умець*:

– імправізаваць на падставе традыцыйных рухаў, уласцівых беларускаму побытавыму танцу;

– класіфікаваць побытавыя танцы;

*валодаць*:

– выкананнем кампазіцый побытавых танцаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец» усяго прадугледжана 140 гадзін. Праграма падзяляецца на два раздзелы, першы з якіх складае 72 гадзіны і другі – 68 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік (форма: творчы паказ).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец», сувязь з іншымі дысцыплінамі. Беларускі побытавы танец, вытокі і развіццё. Лакальныя кампазіцыі і распаўсюджаная пластыка рухаў па ўсёй краіне як асаблівасць харэаграфічнага мастацтва беларусаў. Побытавы танец у каляндарна-абрадавым і сямейна-абрадавым фальклоры.

### Раздзел I. Абрадавыя побытавыя танцы

***Тэма 1. Лексіка народнага танцу***

Элементы народнай харэаграфіі. Выпрацоўка правільнай, прыгожай паставы корпуса. Уменне лёгка, грацыёзна, манерна рухацца. Асвойванне танцавальных рухаў: «трохкрок», «вяровачка», «галоп», «полька-трасуха», «дробная полька» і інш. Асноўныя прытупы, уласцівыя побытавыму танцу. Адзінарны прытуп з акцэнтам у гору і адзінарны прытуп з акцэнтам уніз як асноўныя прыёмы. Танцавальныя ключы.

***Тэма 2. Побытавыя тацы ў сямейна-абрадавай творчасці беларусаў***

Побытавыя танцы, якія выконваюцца падчас сямейных абрадаў і іх лакальна-рэгіянальныя версіі. Сольныя побытавыя танцы, прымеркаваныя да вясельнай абраднасці беларусаў: «Чобаты» (Мазырскае Палессе), «Жабка», «Заяц».

***Тэма 3. Імправізацыя ў побытавым танцы***

Месца імправізацыі ў традыцыйнай танцавальнай культуры беларусаў. Развіццё навыку імправізацыі студэнтаў у стылі «народных майстроў» побытавага танцу. Падрыхтоўка студэнтамі побытавых танцаў з элементамі імправізацыі. Імправізаваны танец «Мікіта». Прадугледжана праверка ведаў у межах бягучай атэстацыі.

***Тэма 4. Сольныя танцы і пляскі, прымеркаваныя да вясельнай абраднасці беларусаў***

Вывучэнне жаночых сольных танцаў «Лявоніха» і «Разгулялася Дуня». Адпрацоўка мужчынскіх побытавых танцаў «Жабка», «Чобаты». Пляска як

танцавальны жанр. Адпрацоўка рухаў пляскі «Барыня пад расказ», «Раскамарыцкі».

***Тэма 5. Карагоды, прымеркаваныя да каляднай абраднасці беларусаў***

Знаёмства з месцам танцавальнай культуры беларусаў у каляндарна-абрадавай творчасці. Вывучэнне карагодаў як віда народнага харэаграфічнага мастацтва. Аднаўленне карагоду «Пасеялі дзеўкі лён», прымеркаванага да Каляд (в. Галавенчыцы Чавускага р-на Магілёўскай вобл.) і інш.

***Тэма 6. Карагодныя танцы, прымеркаваныя да вясенняй абраднасці беларусаў***

Вызначэнне функцыі веснавых карагодаў. Адпрацоўка стылістыкі выканання. Перайманне побытавых танцаў, напрыклад, «Церніца» (аг. Хацiслаў, Маларыцкі раён, Брэстская вобласць) і іншых. «Крывы танок» як від веснавых карагодных танцаў (выконваецца зігзагападобнымі лініямі).

***Тэма 7. Летнія карагоды***

Карагоды, прымеркаваныя да «Купалля». Адкрытыя і закрытыя корогоды. Падвоеныя і адзінарныя. Карагоды з хуткімі прытанцоўкамі, напрыклад, «У карагодзе мы былі».

***Тэма 8. Танцавальныя карагоды, прымеркаваныя да восеньскай абраднасці***

Побытавыя танцы, прымеркаваныя да Пакроваў. Парны беларускі побытавы танец «Базар». Пляскі, прымеркаваныя да гульні «Ката пячы» (аг. Скірмантава, Дзяржынскі раён, Мінская вобласць). Традыцыя правядзення «Піліпаўскіх вячорак».

## Раздзел II. Вячоркавыя побытавыя танцы

***Тэма 9. Сольныя танцы***

Сольныя танцы і пляскі, якія выконваліся на вячорках. Вывучэнне побытавага танцу «Барыня». Адпрацоўка ўласцівых танцавальных элементаў: «танцавальныя ключы» і іх разнастайнасць, «вяровачка», «кавыралачка», прысядкі і інш.

***Тэма 10. Парныя танцы***

Асноўныя паставы і крокі ў парных пабытавых танцах. Разнастайныя пабытавыя танцы і іх лакальна-рэгіянальныя варыянты («Ойра», «Месяц», «Пакруціха», «Кракавяк», «Падыспан» (аг. Хацілаў, Маларыцкі р-н, Брэсцкая вобл.), «Лявоніха» (у разнастайных лакальных версіях), «Каханачка» (г. Любань, Мінская вобл.), «Полька-Ойра» (Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл.), «Двойка» (В. Гайна, Лагойскі р-н, Мінская вобл.)).

***Тэма 11. Танцы ў тройках***

Засваенне пабытавых танцаў у тройках: «Лявоніха» (в. Пянькі Мазырскага р-на Гомельскай вобл.), «Гапак» (в. Мётча Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), «Нарэчанька» (в. Запясочча Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.).

***Тэма 12. Танцы ў чацвёрках***

Знаёмства з лакальнымі версіямі пабытавых танцаў у чацвёрках і адпрацоўка выканання пабытавых танцаў «Мазурка» (Гомельская вобл.), «Каханачка» (аг. Ракаў, Мінская вобл.).

***Тэма 13. Парна-гуртавыя танцы***

Знаёмства з паняццем «гуртавыя танцы». Вывучэнне кадрылі як парна-гуртавога танца. Развучванне кадрылей з захаваннем рэгіянальных асаблівасцей пластыкі рухаў. Расшыфроўка запісаў і рэканструкцыя кампазіцыі ў межах бягучай атэстацыі. Кадрылі на 2 пары: «Лявоніха» (калена кадрылі) (в. Гарадзец Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.), «Левашоўская кадрыля» (в. Левашы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), «Іванкаўшчынская кадрыля» (в. Іванкаўшчына Мазырскага р-на Гомельскай вобл.), «Дзербінкаўская кадрыля» (в. Дзербінкі Мазырскага р-на Гомельскай вобл.). Кадрыля на 4 пары: «Глінішчанская кадрыля» (в. Глінішчы Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.) і інш.

***Тэма 14. Шматфігурныя танцы***

Прагляд відэазапісаў ад носьбітаў традыцыі. Аднаўленне шматфігурнага танца «Лявоніха» (в. Засецце Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.).

***Тэма 15. Імправізацыя ў парных побытавых танцах***

Развіццё навыку імправізацыі і адчування стылістыкі рухаў побытавага танцу беларусаў. Падрыхтоўка студэнтамі побытавых танцаў з элементамі імправізацыі, напрыклад, «Полька імправізаваная», распаўсюджаная па ўсёй Беларусі, і лакальнага варыянту танцу «Барыня» у парах.

***Тэма 16. Прысядкі як элемент імправізацыі***

Разнастайнасць прысядак і тэхнік іх выканання. Адпрацоўка руху «Мячык». Вывучэнне побытавага танцу «Яблачка» у лакальна-рэгіянальных версіях, распаўсюджаных па тэрыторыі Беларусі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
вучэбнай дысцыпліны

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Лекцыйныя заняткі | Практычныя . | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю . |
|---|---|---|---|---|---|
| | Уводзіны | 2 | | | |
| **Раздзел I. Абрадавыя побытавыя танцы** | | | | | |
| 1. | Лексіка народнага танца | | 8 | | |
| 2. | Побытавыя тацы ў сямейна-абрадавай творчасці беларусаў | | 8 | | |
| 3. | Імправізацыя ў побытавым танцы | | 8 | 2 | паказ |
| 4. | Сольныя танцы і пляскі, прымеркаваныя да вясельнай абраднасці беларусаў | | 8 | | |
| 5. | Карагоды, прымеркаваныя да каляднай абраднасці беларусаў | | 8 | | |
| 6. | Карагодныя танцы, прымеркаваныя да вясенняй абраднасці беларусаў | | 8 | | |
| 7. | Летнія карагоды | | 8 | | |
| 8. | Танцавальныя карагоды, прымеркаваныя да восеньскай абраднасці | | 8 | 4 | паказ |
| **Раздзел II. Вячоркавыя побытавыя танцы** | | | | | |
| 9. | Сольныя танцы | | 8 | | |
| 10. | Парныя танцы | | 8 | | |
| 11. | Танцы ў тройках | | 8 | | |
| 12. | Танцы ў чацвёрках | | 8 | | |
| 13. | Парна-гуртавыя танцы | | 8 | 4 | паказ |
| 14. | Шматфігурныя танцы | | 8 | | |
| 15. | Імправізацыя ў парных побытавых танцах | | 8 | | |
| 16. | Прысядкі як элемент імправізацыі | | 8 | | |
| | **Усяго:** | **2** | **128** | **10** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Богданов, Г. Ф.* Русский народный танец: теория и история : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Г. Ф. Богданов. - Москва : Юрайт, 2021. – С. 15-39.

2. *Богданов, Г. Ф.* Народный танец : учеб. и практикум для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Г. Ф. Богданов. - 2-е изд., испр. и доп. - Москва : Юрайт, 2021. – 343 с.

3. Историко-бытовой и современный бальный танец: бальные танцы XIX в. : учеб.-метод. пособие для студентов 1-17 02 01 Хореографическое искусство (по направлениям), направлений специальности 1-17 02 01-04 Хореографическое искусство (народный танец); 1-17 02 01-05 Хореографическое искусство (бальный танец); 1-17 02 01-06 Хореографическое искусство (эстрадный танец); 1-17 02 01-10 Хореографическое искусство (современный танец) / Белорусский государственный университет культуры и искусств ; [сост. И. И. Бодунова].- Минск : БГУКИ, 2020. – С. 86-110.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / [аўтар ідэі і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева ; аўтары: А. М. Боганева і інш.]. - Мінск : Вышэйшая школа, 2006. - 736 с.


*Дадатковая*


1. *Алексютович, Л. К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л. К. Алексютович / под ред. М. Я. Гринблата. – Минск : Вышэйшая школа, 1978. – 528 с.

2. *Гребенщиков, С.* Белорусские танцы / С. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1978. – С. 102.

3. *Гусев, Г. П.* Методика преподавания народного танца. Танцевальные движения и комбинации на середине зала: учеб. пособие для студентов вузов культуры и искусств / Г. П. Гусев. – М. : ВЛАДОС, 2003. – С. 14-58.

4. *Козенка, М. А*. Лексіка беларускага народна-сцэнічнага танца / М. А. Козенка. – Мінск : Полымя, 1993. – 110 с.

5. *Хворост, И. М.* Белорусские танцы / И. М. Хворост. – Минск : Беларусь, 1977. – 151 с.

6. *Чуркін, М.* Беларускія народныя песні і танцы / М. Чуркін. – Мінск : Вышэйшая школа, 1949. – 528 с.

7. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор: традиции и современность / Ю. М. Чурко; вступ. ст. С. В. Гутковской. – Минск : Четыре четверти, 2016. – 388 с.

8. *Чурко, Ю. М.* Вянок беларускіх танцаў / Ю. М. Чурко. – Минск : Беларусь, 1994. – 88 с.

**Пералік**

**рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі**

1. Паказ імправізаваных побытавых танцаў адпаведна традыцыі;
2. Паказ рэканструяваных побытавых танцаў у традыцыйнай манеры выканання;
3. Вуснае апытанне;
4. Бягучая атэстацыя ў сярэдзіне вучэбнага семестра (форма: творчая работа).

**Метадычныя рэкамендацыі**

**па арганізацыі і здзяйсненні самастойнай працы студэнтаў**

Самастойная праца студэнтаў у межах раздзела вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец» уключае ў сябе наступныя формы:

1) вывучэнне матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны;
2) выкарыстанне відэаматэрыялаў;
3) падрыхтоўка імправізаваных танцаў;
4) падрыхтоўка да практычных заняткаў і заліку.

*Вывучэнне матэрыялу вучэбнай дысцыпліны* мае на мэце працу студэнтаў з відэазапісамі, друкаванай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнэт.

*Выкарыстанне відэаматэрыялаў* з'яўляецца адной з найбольш значных форм самастойнай работы ў межах вучэбнай дысцыпліны «Беларускі побытавы танец», якое складаецца з прагляда, аналіза і расшыфроўкі відэазапісаў харэаграфічных узораў у выкананні носьбітаў традыцый пэўнай лакальнай мікразоны.

*Падрыхтоўка імправізаваных танцаў* складае значную частку самастойнай работы студэнтаў, якая прадугледжвае самастойную падрыхтоўку кампазіцыі імправізаванага побытавага танцу з захаваннем стылістыкі выканання носьбітамі традыцыі.

*Падрыхтоўка да практычных заняткаў* патрабуе творчага падыходу (назапашванне вопыту танцавальнай імправізацыі), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры, авалодванне тэарэтычнымі ведамі і адчуваннем стылю побытавага танцу.

*Падрыхтоўка да бягучай атэстацыі і заліку* прадугледжвае расшыфроўку запісаў узораў побытавых танцаў ад носьбітаў традыцыі і іх аднаўленне ў межах вучэбных заняткаў, што з'яўляецца абавязковай творчай работай, якая кантралюецца ў межах бягучай атэстацыі. Засваенне танцавальных узораў, іх мастацкае выкананне ў межах канцэртнай праграмы з'яўляецца асноўным патрабаваннем да заліку ў форме творчага паказу.

## Прыкладны рэпертуар для выкарыстання ў якасці самастойнай работы студэнтаў

Кадрылі на 2 пары:

– «Левашоўская кадрыля» (в. Левашы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.),

– «Іванкаўшчынская кадрыля» (в. Іванкаўшчына Мазырскага р-на Гомельскай вобл.),

– «Дзербінкаўская кадрыля» (в. Дзербінкі Мазырскага р-на Гомельскай вобл.);

Кадрыля на 4 пары:

– «Глінішчанская кадрыля» (в. Глінішчы Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.);

Кадрыля на неабмежаваную цотную колькасць пар:

– «Лявоніха» (калена кадрылі) (в. Гарадзец Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.);

Шматфігурны танец: «Лявоніха» (в. Засецце Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.).

## 4.4. Відэазапісы побытавых танцаў